База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# Масква ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам Беларускага фронта, якія вызвалілі Гомель

26 лістапада Масква ад імені Радзімы салютавала доблесным войскам Беларускага фронта, якія ў выніку смелага абыходнага манеўра авалодалі абласным і вялікім прамысловым цэнтрам Беларусі – горадам Гомель – важным вузлом чыгунак і магутным апорным пунктам абароны немцаў на Палескім напрамку.

У 21 гадзіну сталіца пачула пераможныя грымоты артылерыйскага салюта. Дваццаццю залпамі з двухсот дваццаці чатырох гармат яна вітала слаўных сыноў савецкага народа, якія выганяюць нямецкіх захопнікаў з нашых гарадоў і вёсак. Неба асвятлілася рознакаляровымі ракетнымі агнямі.

Салют перадаваўся па радыё. Яго слухала ўся краіна.

Масква ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам Беларускага фронта, якія вызвалілі Гомель // Савецкая Беларусь. – 1943. – 27 лістапада (№ 113). – С. 1.